*А. Вялікі (Мінск)*

# МІНСКІ ПРАЦЭС НАД КСЯНДЗАМІ. 1922 г.

У пачатку 20-х г. XX ст. лінія партыі ў адносінах да рэлігіі і царквы была выпрацавана ў час правядзення кампаніі па адабранні царкоўных каштоўнасцей. Гэтая экспрапрыяцыя праходзіла пад лозунгам збору сродкаў у дапамогу ахвярам голаду, які абрынуўся на краіну ў другой палове 1921 г. Нават па афіцыйных даных савецкай гістарыяграфіі, голадам было ахоплена звыш 22 млн чалавек, а да мая 1922 г. у найбольш пацярпелых раёнах Паволжжа, Урала, Казахстана, Украіны памерла ад голаду звыш 1 млн чалавек. У пошуках дадатковых сродкаў для закупкі прадуктаў харчавання кіраўніцтва бальшавіцкай партыі звярнула ўвагу на царкоўныя каштоўнасці. Улады Беларусі таксама далучыліся да гэтай кампаніі. 1 сакавіка 1922 г. на пасяджэнні прэзідыума ЦВК БССР было прынята рашэнне аб далучэнні рэспублікі да экспрапрыяцыі царкоўных каштоўнасцей для дапамогі галадаючым[1].

З мэтай высвятлення адносін беларускага святарства да акцыі экспрапрыяцыі каштоўнасцей 8 сакавіка 1922 г. было праведзена пасяджэнне спецыяльна створанай камісіі па экспрапрыяцыі каштоўнасцей, на якую былі запрошаны прадстаўнікі галоўных канфесій Беларусі: праваслаўнай, рымакаталіцкай, іудзейскай і пратэстанцкай. Рэакцыя духавенства аказалася неадназначнай. Глава Праваслаўнай Царквы епіскап Мелхіседэк выказаўся за добраахвотную здачу ўсіх каштоўнасцей. Пратэстанты катэгарычна заявілі, што каштоўнасцей у іх не маецца. Каталікі таксама адмовіліся падтрымаць гэту кампанію. Галоўны равін Беларусі не адмаўляўся дапамагаць галадаючым, але не ўказаў, колькі ж маецца ў сінагогах каштоўнасцей[2]. Аднак ад пазіцыі царкоўных іерархаў нічога не залежала і кампанія па экспрапрыяцыі каштоўнасцей пайшла поўным ходам.

Паколькі рыма-каталіцкае духавенства катэгарычна адмовілася аддаваць каштоўнасці, то беларускія ўлады рашылі ўчыніць паказальны працэс над «мракабесамі», якія не спачувалі галадаючым. Падрыхтоўка працэсу над ксяндзамі пачалася з масіраванай прапагандысцкай кампаніі. Першым крокам да яе стаў невялікі артыкул у «Звяздзе», у якім паведамлялася, што рабочыяпалякі фабрыкі «Энергія» на сходзе патрабавалі тэрмінова адабраць з усіх касцёлаў каштоўнасці і перадаць іх на карысць галадаючых Паволжжа[3].

---

[1] Протько Т. С. Становление советской тоталитариой системы в Беларуси (1917—1941 гг.) / Т. С. Протько. — Минск .: Тесей, 2002. — С. 276.

[2] Там жа. С. 277.

[3] Беспартийные польские рабочие требуют изъятия ценностей // Звезда. 1922. 16 апр, С. 2.

Наступным крокам у кампаніі па канфіскацыі касцельных каштоўнасцей стаў мітынг польскага насельніцтва Мінска, які адбыўся ў клубе імя. Р. Люксембург. На ім была аднагалосна прынятая рэзалюцыя: «Мы, сабраўшыяся ў зале рабочага польскага клуба, беспартыйныя палякі-каталіцкага веравызнання з улікам страшэнных памсраў голаду ў Паволжжы і ў мэтах выратавання ад галоднай смерці мільёнаў нашых братоў рабочых і сялян Паволжжа лічым неабходным тэрмінова канфіскаваць з каталіцкіх касцёлаў усе каштоўнасці, для закупкі прадуктаў харчавання для галадаючых Паволжжа»[1].

У канцы красавіка 1922 г. беларускія ўлады рашылі «пагуляць» у дэмакратыю і запрасілі ў рэспубліканскую камісію дапамогі галадаючым Паволжжа кс. Вайцяхоўскага з тым, каб высвятліць яго пункт гледжання адносна канфіскацыі каштоўнасцей з касцёлаў. У камісіі кс. Вайцяхоўскі цвёрда заявіў, што дапамагаць пацярпелым ад голаду бсзумоўна неабходна. Разам з тым, ён катэгарычна адмовіўся даваць згоду на канфіскацыю каштоўнасцей, тлумачачы гэта тым, што ўся маёмасць касцёлаў знаходзіцца ў падпарадкаванні Папы Рымскага і яго прадстаўніка ў Расіі. Што ж датычыць яго пазіцыі, то ён катэгарычна супраць канфіскацыі каштоўнасцей з касцёлаў, паколькі не мае на гэта адпаведнага распараджэння. У сувязі з прымусовым адабраннем каштоўнасцей ён будзе глядзець на гэта як «на насілле ўлады ў дачыненні да каталіцкай царквы»[2]. У сувязі з такой пазіцыяй кс. Васілеўскага ананімны аўтар артыкула ў «Звяздзе» задаецца пытаннем: «Якія ж хрысціянскія пачуцці чалавекалюбства, гавораць у прадстаўніка каталіцкай царквы, калі нават пачуцці братэрскай любові, спачування галадаючым і гінучым ад голаду брацьцям, адсутнічаюць у іх, калі яны з кафедры гавораць аб любові да бліжняга. На самай справе, праяўляючы да бліжняга жорсткасць, хто ж здзяйсняе насілле і нічым не змываемы цяжкі грэх?»[3].

Пазіцыя кс. Васілеўскага, якая фактычна з'яўлялася пазіцыяй касцёла, не магла быць незаўважанай уладамі. 25 красавіка 1922 г. «Звязда» у перадавым артыкуле пісала: «[…] У яўрэйскіх сінагогах усс каштоўнасці былі адабраныя. […] У праваслаўных цэрквах мы сустракалі згоду на канфіскацыю і толькі кс. Васілеўскі вікарны ксёндз Мінскага кафедральнага касцёла пагардліва, з нявіннай усмешкай на вуснах заяўляе, «Без благаславення Папы Рымскага я згадзіцца на канфіскацыю каштоўнасцей не магу». […] Адказ кс. Васілеўскага, пакідаючага галадаючых на новыя мукі павінен быць належным чынам ацэнены кожным сумленным веруючым грамадзянінам Беларусі. Што адкажуць на гэта тыя палякі, якія толькі на днях у сваім польскім клубе пастанавілі

[1] Поляки требуют изъятия // Звезда. 1922. 20 апр. С. 2.
[2] Кто виноват? // Звезда. 1922. 23 апр. С. 2.
[3] Там жа. С. 2.

аддаць свае царкоўнае хараство галадаючым? Што адкажуць на адмову ксяндза Васілеўскага чыгуначныя рабочыя Заходняй чыгуначнай дарогі, [...] прыняўшыя аднагалоснае рашэнне аб канфіскацыі каштоўнасцей. Яны патрабуюць, каб савецкая ўлада даказала кс. Васілеўскаму, што кашмарныя пакуты галадаючага насельніцтва Паволжжа не чакаюць збаўства ад Рымскага Папы. Савецкая ўлада зможа замірыць «князёў» царквы, якія не жадаюць спусціцца сваіх сытых нябёс да сваіх зямных галодных сыноў»[1].

Адзначым, што толькі прадстаўнікі каталіцкага духавенства адмовіліся «добраахвотна» аддаваць каштоўнасці, у той час як праваслаўнае і іудэйскае духавенства не так жорстка і прынцыпова ставіліся да рабаўніцтва храмаў.

Тым не менш, нягледзячы на адмаўленне добраахвотна здаваць каштоўнасці 2 мая 1922 г. камісія, у якую ўваходзілі С. Галунціс (старшыня), Клыс, Грузель абследавала і правяла канфіскацыю каштоўнасцей з Мінскага кафедральнага касцёла. Па прыбыцці ў касцёл камісіі быў прадстаўлены вопіс, у якім пазначалася, што ў касцёле не маецца ніякіх каштоўнасцей. Нягледзячы на гэтае камісія абследвала касцёл і выявіла «шмат каштоўнасцей», якія не значыліся ў вопісу. Было канфіскавана: золата — 2 залатнікі, срэбра — 1 пуд 20 фунтаў і 57 залатых манет[2].

3 мая гэтая ж самая камісія прадоўжыла канфіскацыю каштоўнасцей з іншых мінскіх касцёлаў. Так, з Дамініканскага касцёла было сканфіскавана срэбра 89 залатнікоў і 40 долей, золата — 90 долей. Складаней праходзіла канфіскацыя ў Бернардзінскім касцёле. Прыйшоўшы да касцёла камісія ўбачыла, што ён зачынены. Без хістанняў быў зламаны замок, аднак у касцёле знайшлі і канфіскавалі ўсяго 5 залатнікоў срэбра. Пасля Бернардзінскага, камісія накіравалася да касцёла на Залатой Горцы, які быў таксама закрыты, таму і тут прыйшлося ламаць замок. З касцёла было забрана срэбра — 1 пуд 54 залатнікі, золата — 45 долей і медзі ў манетах — 2 фунты 18 залатнікоў. Камісія не мінула і капліцу пры касцёле. З яе было забрана 13 фунтаў і 60 залатнікоў срэбра. Наступны касцёл, які падвергся рабаўніцтву, быў на Захар'еўскай вуліцы. У ім было канфіскавана: срэбра 21 фунт 43 залатнікі, золата — 3 залатнікі, медных манет — 63 шт.[3] Акрамя каштоўнасцей з усіх касцёлаў забіралі прадметы, якія мелі гістарычна-мастацкую каштоўнасць. Яны перадаваліся ў мастацкі музей.

Цікава адзначыць, што факты рабаўніцтва былі сфатаграфаваны мінскім фатографам — яўрэям І. Метарам. Аднак ДПУ не «даравала» яму такога «лёгкадумства» і ён разам з ксяндзамі сеў на лаву падсудных. Запрасіў І. Метара здымаць рабаўніцтва кс. Тамашэўскі. ДПУ даведалася аб гэтым і пры

---

[1] Кто предает голодающих? // Звезда. 1922. 25 апр. С. 1.

[2] Изъятие ценностей в минских костёлах // Звезда. 1922. 4 мая. С. 1.

[3] Изъятие ценностей из костёлов // Звезда. 1922. 6 мая. С. 1.

арышце Тамашэўскага ўпарта шукала гэтыя фотаздымкі. Аднак кс. Тамашэўскі сказаў, што здымкі ў яго ўкралі. Разам з тым, у польскай прэсе з'явіліся здымкі і шматлікія артыкулы пра рабаўніцтва мінскіх касцёлаў. ДПУ таксама прызнала, што сачыла за Тамашэўскім і зафіксавала, што ён заходзіў на кватэру польскага прадстаўніка па справах рэпатрыяцыі Цыхоўскага напярэдадні ад'езду апошняга ў Польшу. Чэкісты зрабілі выснову, што здымкі маглі быць перададзены ў польскую прэсу праз Цыхоўскага. Магчыма меркаваць, што так яно і было.

Прынцыповая пазіцыя мінскіх каталіцкіх святароў выклікала імгненную і жорсткую рэакцыю беларускага кіраўніцтва. 4 мая 1922 г. ДПУ друкуе афіцыйнае паведамленне «Ад Дзяржпалітупраўлсння Беларусі», у якім вылучаюцца абвінавачванні ксяндзам[1].

Арышт ксяндзоў суправаджаўся моцнай ідэалагічнай кампаніяй. Загалоўкі артыкулаў у цэнтральных газетах кшталту «Людаедаў да адказу», «Контррэвалюцыя ў касцёлах», не зыходзілі з палос газет амаль штодня[2]. Аднак прапагандысцкай кампаніяй справа не скончылася. Па справе ксяндзоў было арыштавана 10 чалавек: з іх тры ксяндзы — Адам Лісоўскі, Ян Васілеўскі, Міхаіл Тамашэўскі. Разам з імі арыштавалі бухгалтара Станіслава Дашчынскага, слесара Стэфана Леванеўскага, канцылярыста Іосіфа Асінскага, захрысціяна Фёдара Лысакоўскага, рэзніка Францішка Мілашэўскага і ўжо ўзгаданага фатографа Ізраіля Метара.

У склад Надзвычайнай сесіі Рэвалюцыйнага Трубунала, які судзіў ксяндзоў, уваходзілі: нарком Наркомаховы здароўя М. Стакоўскі (старшыня), сябры — начальнік асобага аддзела, адначасова начальнік контразведкі ДПУ БССР Я. Кепе, нарком земляробства А. Славінскі, сакратар — Шашкевіч. Дзяржаўнымі абвінаваўцамі з'яўляліся маскоўскія «госці» Ю. Ляшчынскі і Песткоўскі.

Інтарэсы ксяндзоў адстойвалі абаронцы Шпакаў, Метлін, Гарковіч і Крэйнес.

Суд пачаўся са спрэчак, на якой мове весці працэс — польскай ці расейскай. Абаронцы падсудных хадайнічалі аб вядзенні суда на польскай, аднак ксяндзы патрабавалі вядзення працэсу на расейскай мове. Разам з тым, бакі пагадзіліся, што пры неабходнасці будзе ажыццяўляцца пераклад з расейскай на польскую мову.

У чым жа абвінавачваліся ксяндзы ? Фактычна абвінавачванні былі сфармуляваныя яшчэ ў адкрытым лісце Дзяржпалітупраўлення Беларусі і заключаліся ў наступным: сабатаж і контррэвалюцыйная агітацыя; супраціўленне ўладам пры адабранні каштоўнасцей; сувязь з контррэвалюцыяй.

---

[1] От политуправления Белоруссии // Звезда. 1922. 4 мая. С. 1.

[2] Ржепинский М. Людоедов к ответу // Звезда. 1922. 6 мая. С. 1.

Астатнія падсудныя абвінавачваліся ў дапамозе ксяндзам. Напрыклад, узгаданы І. Метар абвінавачваўся, што выконваў даручэнне кс. Тамашэўскага і зрабіў здымкі алтара Мінскага кафедральнага касцёла перад і пасля канфіскацыі і аддаў не толькі здымкі але і негатывы Тамашэўскаму і не папярэдзіў аб гэтым мінскія ўлады. Іваноўскі быў абвінавачаны ў тым, што прымаў ўдзел у складанні несапраўднага спісаў касцельных каштоўнасцей і адмовіўся дапамагаць камісіі, якая іх канфіскоўвала.

Першым на працэсе звыш гадзіны дапытвалі кс. А. Лісоўскага. Ён усё абвінавачванні абвяргаў, спасылаючыся на VII артыкул Рыжскага Дагавора, а таксама на тое, што ў яго не было распараджэння Папы Рымскага[1].

Цікавая стэнаграма допыту кс. Васілеўскага, які таксама трымаўся прыстойна, абвяргаў сваю віну і даваў даволі падрабязныя і грунтоўныя адказы на пытанні. Так, на пытанне Стакоўскага: «Ці ведаеце вы факты з гісторыі, калі для ваенных патрэб канфіскоўвалі царкоўныя каштоўнасці?», — ён адказаў: «Гэта рабілася талькі з дазволу Папы Рымскага». На наступнае пытанне, «Каштоўнасці — гэта ўласнаць прыхаджан ці епіскапа», — ён адказаў «Не прыхаджан і не епіскапа, гэта ўласнасць каталіцкай царквы і яе распраджальнікам з'яўляецца Папа Рымскі». Дастаткова цікавы быў яго дыялог з Стакоўскім наконт савецкай улады: «Вы паважаеце ўладу?», — ксендз адказаў «Вучыў заўсёды паважаць і паважаю», «Царскую ўладу паважалі?», «Прапаведваў выконваць усе загады улад, за выключэннем тых, якія прымушаюць нас грашыць». «Чаму вы агітавалі супраць распараджэнняў савецкай улады аб канфіскацыі маёмасці і палохалі прыхаджан карамі?». — «Я не агітаваў супраць савецкай улады, але некалькім асобам, якія звярнуліся да мяне з запытам наконт публікацый у «Звяздзе», ці праўда, што там пішацца, я растлумачыў сэнс маіх адносін да канфіскацыі»[2].

Наступным адказваў кс. Тамашэўскі, які таксама адмаўляў сваю віну. На правакацыйнае пытанне: «Якую уладу вы больш паважаеце — савецкую ці царскую», ён адказаў пытаннем — «Не разумею, навошта гэтае пытанне ?». Наконт здымкаў, якія, паводле меркаванняў ДПУ, ён перадаў у Польшчу, кс. Тамашэўскі адказаў, што яны рабіліся для маючай адбыцца рэстаўрацыі. Што ж датычыць іх перадачы ў Польшчу, то ён адмаўляў гэты факт. На пытанне, чаму ён закрыў касцёл, калі да яго прыйшла камісія, ён адказаў: «Я зрабіў у гэты момант так, як у дадзены момант было неабходна»[3].

На другі дзень выступалі сведкі, г. зн. члены камісіі па канфіскацыі. Усе яны, безумоўна, падкрэслівалі віну ксяндзоў і адзначалі, што яны усяляк сабатавалі канфіскацыю. Так, адзін з сябраў камісіі распавядаў, што калі яны прыйшлі ў касцёл на Залатой Горцы, то ксёндз Лісоўскі адмовіўся размаўляць

---

[1] Гр., Контрреволюция в костёле // Звезда. 1922. 31 мая. С. 3.

[2] Там жа. С. 3.

[3] Контрреволюция в костёле // Звезда. 1922. 1 июня. С. 3.

з імі, а наконт ключоў ад касцёла заявіў, што ён схаваў іх і не мае намеру паказваць дзе яны схаваны. Грузель паказваў, што ў час канфіскацыі ў касцёлах раздаваліся воклічы: «Бальшавікі — рабаўнікі», гэта значыць, што ксяндзы падбухторвалі на такога кшталту выступленні вернікаў[1].

У гэты ж дзень адбыліся спрэчкі паміж абаронцамі і дзяржаўнымі абвінаваўцамі. З боку дзяржаўных абвінаваўцаў выступаў Пясткоўскі, а з боку абаронцаў — кс. Вайцаховіч і Герновіч. Галоўным пунктам спрэчак стаў пункт, што «адзіным» гаспадаром маёмасці з'яўляецца Папа Рымскі. Пясткоўскі ж сцвярджаў, што ксяндзы няправільна перавялі і тлумачаць канон, дзе запісана на латыні «supremus», што значыць не «адзіны», а «вышэйшы». Па гэтым пытанні ўзнікла доўгая палеміка, у выніку эксперты спасылаліся на каноны 1530 г. і 1289 г. ды інш. У рэшце рэшт суд прызнаў, што «экспертыза не дала ніякіх вынікаў ксяндзам і яшчэ раз паказала, што ўсялякія спасылкі на каноны — гэта толькі зброя ў руках ксяндзоў для ўхілення ад садзейнічання канфіскацыі маёмасці»[2].

На трэці дзень выступілі дзяржаўныя абвінаваўцы — маскоўскія «візіцёры»: Ляшчынскі і Песткоўскі. Галоўная роля ў абвінавачванні належала Ляшчынскаму, які ў сваёй прамове звязаў у адно целае падзеі ў Шуі, Гомлі, Віцебску і Мінску і падкрэсліў, што калі ў Шуі справа дайшла да крывапраліцця, а ў Мінску — не, то гэта заслуга Дзяржпалітупраўлення, якое своечасова прыпыніла контррэвалюцыйную дзейнасць ксяндзоў. Ён таксама зазначыў, што ксяндзы спасылаюцца на VII артыкул Рыжскага Дагавора, які гарантуе экстэрытарыяльнасць касцёла ў Беларусі. Аднак, зазначыў ён, гэты артыкул Рыжскага Дагавора супярэчыць унутраннаму праву Беларусі, таму ні аб якой экстэрытарыяльнасці гаворка ісці не можа. Наконт канонаў ён быў ўвогуле лаканічны і безапеляцыйны: «Што яны з сябе ўяўляюць ? Гэта кодэкс варожай нам арганізацыі. Савецкая ўлада абвяргае ўсялякія каноны, бо яна мае свой кодэкс законаў»[3]. Да таго ж, ён абвінаваціў ксяндзоў у контррэвалюцыйнай дзейнасці і сувязі з разведкай Польшчы.

Абаронцы паспрабавалі абвергнуць абвінавачванні Ляшчынскага, але безвынікова, бо вынік быў ужо загадзя ясны.

Ксяндзы Лісоўскі і Тамашэйскі ад апошняга слова адмовіліся і не прызналі сябе вінаватымі, а абвінавачванні, вылучаныя супраць іх — сфальсіфікаванымі.

Ксендз Васілеўскі выступіў амаль з гадзінай прамовай на польскай мове, якая, паводле артыкула ў «Звяздзе», паказала, што ён «не проста каталіцкі святар, а свядомы прыхільнік і ідэолаг каталіцызму»[4].

---

[1] Там жа. С. 3.

[2] Контрреволюция в костёле // Звезда. 1922. 2 июня. С. 3.

[3] Там жа. С. 3.

[4] Там жа. С. 3.

Апошні дзень працэсу зацягнуўся да 21.40 вечара. Суд абвясціў перапынак для прыняцця рашэння, які цягнуўся амаль тры гадзіны. У 1.40 ночы Стакоўскі зачытаў прыгавор. Так ксёндз А. Лісоўскі быў прысуджаны да расстрэлу, але яго замянілі 5-гадовым зняволеннем, кс. Васілеўскі атрымаў 3 гады зняволення, кс. Тамашэўскі адпаведна — 4 гады. Астатнія атрымалі наступныя тэрміны: Іваноўскі — 4 гады зняволення, Дашкевіч - 1,5 гадоў, Мілашэўскі і Лысакоўскі па 6 месяцаў прымусовых работ, Асінскі, Левандоўскі і Метар былі вызвалены ад пакарання[1].

*З. Антановіч, З. Яцкевіч (Мінск)*

## ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ РЫМА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА г. МІНСКА ў XIX — ПАЧАТКУ XX стст.

XIX — пачатак XX ст. з'яўляўся для тэрыторыі сучаснай Беларусі перыядам выпрабавання на здольнасць захавання нацыянальнай культурнай спадчыны. З уваходжаннем у склад Расійскай імперыі насельніцтва далучаных тэрыторый апынулася пад уплывам палітыкі русіфікацыі, і па прынцыпе: «Хто валодае інфармацыяй, той валодае светам», — адлюстравалася на перыядычным друку. У першай палове XIX ст. ён не меў шырокай распаўсюджанасці. Выдавецтва абмяжоўвалася штогадовымі выданнямі часопісаў, якія мелі вузкую накіраванасць. Выключэнне складае перыядычны друк нацыянальна-вызваленчай накіраванасці, аднак ён насіў фрагментарны характар. Толькі ад пачатку XX ст. у сувязі з развіццём рэвалюцыйнага руху і тэхнічным удасканаленнем з'яўляецца вялікая колькасць газет і часопісаў. Таму найбольш яскрава можна паказаць ролю выданняў рыма-каталіцкай царквы ў перыядычным друку на прыкладзе канца XIX — пачатку XX стст., што раней амаль не закранулася даследчыкамі.

Крыніц па перыядычных выданнях рыма-каталіцкага Касцёла міншчыны захавалася ў бібліятэках і архівах г. Мінска няшмат. У асноўным, іх характарыстыка разглядаецца ў дадзеным паведамленні. Амаль адзіным даследваннем па дадзенай праблеме з'яўляецца праца Т. Зянкевіча[2], аднак ім былі ахоплены пераважна крыніцы польскіх архіваў і бібліятэк, таму некаторыя выданні засталіся па-за яго ўвагай. У іх пошуку дапамагалі таксама бібліяграфіі перыядычных выданняў, хаця яны часам абмежаваны зыходзячы з пункту гледжання мэты выдання[3].

---

[1] Контрреволюция в костёле // Звезда. 1922. 1 июня. С. 3.

[2] Zienkiewicz T. Polskie zycie literackie w Minsku w XIX i na poczatku XX wieku (do roku 1921). Olsztyn WSP, 1997. 235 s.

[3] Беляева Л. Н., Зиновьева М. К., Никифоров М. М. Библиография периодических издаиий России 1901—1916 гг.; Алфавитный служебный каталог русских дореволюционных газет (1703 — 1916 гг.). Ленинград , 1958. ; Василевская М. А. Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия: библиография на иностраиных языках. Минск: Национальная библиотека БССР им. В. И. Ленина, 1983.